**Юбілей.** Кніжная выстаўка «Салдацкі лёс», прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У экспазіцыі адлюстраваны творчы шлях Васіля Быкава — ад ранніх сатырычных твораў да самых вядомых, адзначаных вышэйшымі савецкімі ўзнагародамі, аповесцей аб Вялікай Айчыннай вайне. Змешчаны і прыжыццёвыя выданні твораў, пераклады на іншыя мовы, першыя публікацыі ў перыядычным друку, кнігі ўспамінаў, інтэрв'ю і літаратуразнаўчыя даследаванні. Выстаўка «Салдацкі лёс» будзе працаваць да 8 верасня.